## РАЗДЕЛ 2
## МЕЖДУНАРОДНЫЕ ОТНОШЕНИЯ И ДИПЛОМАТИЯ В ЭПОХУ ДРЕВНОСТИ И СРЕДНЕВЕКОВЬЯ

# ДАГАВОР 1229 ГОДА СМАЛЕНСКА, ПОЛАЦКА, ВІЦЕБСКА З РЫГАЙ І ГОЦКІМ БЕРАГАМ ЯК АДНА З КРЫНІЦ ПАЧАТКУ МІЖНАРОДНЫХ АДНОСІН НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У XIII СТ.

А.В. Лепеш (Мінск)

Дагавор 1229 г. Смаленска, Полацка, Віцебска з Рыгай і Гоцкім берагам з'яўляецца неад'емнай часткай гандлёвага права перыяду сярэднявечча, утрымлівае сведкі пра асаблівыя мытныя стасункі з суседнімі партнёрамі, і, безумоўна, уваходзіць у базу крыніц, якія рэгламентавалі пачатак міжнародных адносінаў на беларускіх землях.

У XII–XIII ст. Смаленск, Полацк і Віцебск мелі сур'ёзныя гандлёвыя сувязі, змагаліся за кантроль над рачнымі шляхамі па Дзвіне і імкнуліся прадаставіць гандлярам найбольш выгадныя ўмовы пры ажыццяўленні іх прафесійнай дзейнасць. Уплывовым эканамічным партнёрам для вышэй названых гарадоў з'яўляўся так званы Гоцкі бераг, або Готланд ("Зямля готаў") – самы вялікі востраў ў Балтыйскім моры, які зараз належыць Швецыі. З XI ст. Готланд заняў вядучыя пазіцыі ў пасрэдніцкім гандлі паміж Усходняй і Заходняй Еўропай, а таксама дамінаваў у балтыйскім гандлі дзякуючы свайму ўдаламу месцазнаходжанню. На ўзбярэжжы вострава была размешчана сістэма гаваняў, якая ва ўсходнеславянскіх летапісах узгадваецца як Гоцкі бераг. Адной з гаваняў з'яўляўся горад паспяховых нямецкіх купцоў Вісбю, які з цягам часу стаў адміністрацыйным цэнтрам Готланда і значным горадам (аж да ўзвышэння Любека) Ганзейскага саюза – буйнога эканамічнага і палітычнага аб'яднання гандлёвых гарадоў паўночна-заходняй Еўропы, што існаваў з сярэдзіны XII ст. і да XVII ст. У Ганзейскі саюз перыяда яго росквіту уваходзіла да 100 як прыморскіх нямецкіх гарадоў (Любек, Брэмен, Гамбург і інш.), так і канентальныя нямецкія гарады і некаторыя не нямецкія гарады таксама. Саюз быў арганізаваны з мэтай сумеснай барацьбы з піратамі. Шляхам дамоў з краінамі-контрагентамі ганзейцы дабіваліся розных прывілеяў, каб захапіць камерцыйную гегемонію. Трэба сказаць, што Ганзейскі саюз не быў дастаткова трывалым, кожны горад захоўваў сваю эканамічную самастойнасць. У краінах, з якімі ганзейскія купцы вялі гандаль, засноўваліся факторыі, якія ўяўлялі сабой умацаваныя паселішчы купцоў, дзе ажыццяўляліся гандлёвыя аперацыі і дзе захоўваўся тавар [4, с. 261]. Прыкладам, такая факторыя Ганзы існавала ў Полацку у XIII–XVI стст. З іншых ганзейскіх гарадоў сваіх купцоў у Полацк прысылалі з Вісбю, Гданьска, Любека [3, с. 129].

Горад Вісбю стаў для нямецкіх купцоў трамплінам на рускі рынак: да багатага на пушніну і воск Ноўгарада. У Ноўгарадзе готландскія купцы мелі нават свой гасцінны двор. Ноўгарад, Смаленск, Полацк бачылі ў Ганзейскім саюзе сапраўдную інтэграцыйную пляцоўку для вырашэння

гандлёвых пытанняў, якія б спрыялі росту тавараздвароту і стымулявалі развіццё рамяства.

Рыга, заснаваная ў 1201 г., была адной з ключавых гульцоў у сістэме гандлёвых аперацый Паддзвіння і на ўсходнім узбярэжжы Прыбалтыкі. Рыга стала адным з галоўных гандлёвых партнёраў для Полацка і Віцебска. Яна фактычна кіравала факторыяй Ганзы ў Полацку, якую лічыла сваім філіялам [3, с. 129]. З цягам часу ў Рызе з'явілася і прадстаўніцтва полацкіх і віцебскіх гандляроў. У Рызе ў XIII ст. для купцоў з усходнеславянскіх земляў, перш за ўсё з Полацка, Віцебска і Смаленска, было арганізавана "Рускае падвор'е" – кампактны раён пражывання гандляроў і рамеснікаў.

Вялікае значэнне ў эканамічным жыцці старажытных беларускіх княстваў у IX–XIII стст. адыгрываў шлях "з варагаў у грэкі", які злучаў Балтыйскае і Чорнае моры. Значнасць дадзенага шляху заключалася ў тым, што ён са старажытных часоў з'яўляўся стрыжнем эканамічнага палітычнага, а потым і культурнага жыцця ўсходняга славянства. Вынікам дынамічнага гандлёвага руху па шляху "з варагаў у грэкі" з'явілася ўзнікненне ў VIII–IX стст. старажытных усходне-славянскіх гандлёвых гарадоў, такіх, як Кіеў, Чарнігаў, Ноўгарад, Перыяслаўль, Смаленск, Растоў, Ладага, Пскоў, Полацк, Віцебск. З даўніх часоў кантроль над гэтым шляхам імкнуліся ўсталяваць Ноўгарад, Полацк, Смаленск, бо гэта гарантавала паступленне дадатковых прыбыткаў на карысць князя і дзяржавы. З гэтай нагоды можна ўзгадаць бітву полацкага князя Брачыслава Ізяславіча с наўгародскім князем Яраславам Мудрым у 1021 г. на рацэ Судаміры, якая скончылася паражэннем першага. Але, відаць, нездарма Яраслаў атрымаў мяшушку Мудрага, бо, нягледзячы на перамогу, знайшоў магчымасць пайсці на замірэнне са сваім родным пляменнікам Брачыславам і нават падараваў полацкаму князю два гарады – Віцебск і Усвяты. Фактычна гэта значыла тое, што Яраслаў Мудры шукаў кампраміс з заходнім суседам у накірунку арганізацыі і кантролю гандлёвага патоку па знакамітаму шляху.

Адзначым, што важным фактарам "полацкай" часткі шляха "з варагаў у грэкі", ў адрозненні ад канкуруючага з ім "наўгародскага", было тое, што праз "полацкі" адрэзак можна было, па першае, значна скараціць дадзены шлях, а, па-другое, Полаччына давала купцам альтэрнатыву ў накірунку далейшага падарожжа: або рухацца далей на поўнач, або на паўночны ўсход. Гэтыя акалічнасці, неабходна думаць, прадвызначалі патэнцыяльны выбар гандляроў і спрыялі ператварэнню Полацка ў сапраўдны гандлёвы цэнтр. Відавочна, што і сам Полацк імкнуўся выкарыстаць свае зручнае становішча. Дзякуючы ўсталяванню сістэмы спагнання гандлёва-мытных падаткаў у Полацкім княстве, надзяленню фіскальнымі функцыямі шэрагу падначаленых князю валоцкіх цівуноў, мытнікаў, служэбнікаў, Полацк у канцы XI – сярэдзіне XII стст. стаў самым заможным горадам на тэрыторыі Беларусі. Сярод ключавых імпартных тавараў, якія завозіліся на Полаччыну, неабходна вызначыць шаўковыя тканіны, прадметы ўпрыгожванняў, спражкі, свяцільні, спецыі, якія прывозілі з Усходу; жалезныя вырабы (сякеры, нажы, мячы), металічную сыравіну (жалеза, волава, цынк, срэбра, медзь), што паступалі са Скандынавіі; віно, якое везлі з прычарнаморскіх правінцый Візантыі; тканіну, соль, якія траплялі з Германіі; бурштын,

сялёдку, якія дастаўлялі з берагоў Балтыйскага мора. Нават пры раскопках на тэрыторыі Полацка былі знойдзены, праўда у адзінкавым экзэмпляры, сердалік, сапфір, горны крышталь, што паступалі сюды з пярэдняй Азіі [3, с. 127]. Увогуле набыць аксаміты, пацеркі, бразготкі візантыйскага або кіеўскага паходжання, мячы і іншую зброю з Германіі і Сандынавіі можна было толькі ў полацкіх купцоў, што спрыяла эканамічнай манаполіі Полаччыны на дадзены пералік прадметаў [3, с. 129]. У сваю чаргу, тавары, якія экспартаваліся палачанамі, карысталіся вялікім попытам на еўрапейскім рынку. Экспартная тагачасная карта ўяўляла сабой пералік наступных прадуктаў: пчаліны воск, мёд, шкуры пушных звяроў (бабра, мядзведзя, рысі, вавёркі, собаля, андатры, а таксама лісы, ваўка, зайца, гарнастая, пясца, ласкі), хмель, смала, дзёгаць, попел і інш.

На Смаленскай зямлі шлях “з варагаў у грэкі” пераходзіў у Вялікі волжскі шлях, што злучаў Камскую Булгарыю і мусульманскі Усход. Праз Смаленшчыну праходзілі і іншыя гандлёвыя шляхі. Смаленск у хуткім часе імкнуўся рэгуляваць гандлёвыя адносіны Полацка і Віцебска. Тым не менш Полацк раней за Смаленск пайшоў на заключэнне гандлёвых дамоваў з Гоцкім берагам, бо ў “Хроніцы Лівоніі” ёсць сведчанне пра тое, што менавіта Полацк падпісаў у 1210 г. дагавор с Гоцкім бергам пры нявызначаным удзеле Смаленска [6, с. 116], а ў 1212 г., відаць, пацвердзіў яго [1, с. 238–239].

Важную ролю ў зараджэнні і развіцці міжнародных адносін ў XIII ст. усё ж адыграў дагавор 1229 г., ініцыяваны смаленскім князем Мсціславам Давыдавічам, які даслаў у Рыгу сваіх прыбліжаных для замацавання дадзенай дамовы. Гэты дагавор распаўсюджваўся таксама на Полацк і Віцебск і быў падпісаны не толькі з Рыгай, але і з Гоцкім берагам. Першапачаткова ён дэклараваў мірныя адносіны дзвух бакоў. Уступ да дагавора ўтрымліваў уводны запіс аб устанаўленні сяброўскіх адносінаў паміж Смаленскам, Рыгаю і Вісбю [5].

Тое, што дадзены дагавор быў складзены не ад імя полацкага князя і ўлічваў інтарэсы, перш за ўсё, смаленскай зямлі, можа азначаць, што ў 30–40-х гг. XIII ст. Полацк слабеў, а ролю лідара ў дадзеным рэгіёне пачало адыгрываць Смаленскае княства. Магчыма, Полацк стаў падначаленым Смаленску ў эканамічным плане [1, с. 238–239].

Дагавор 1229 г. стаў асновай для арганізацыі гандлёвых аперацый па Заходняй Дзвіне. Ён прадастаўляў права свабоднага праезду нямецкім і рускім гандлярам: нямецкім – не толькі ў Полацк, Віцебск, Смаленск, але і за межы апошняга; рускім – у Рыгу, Любек і іншыя гарады, на Гоцкі бераг. Важнымі артыкуламі дагавора сталі артыкулы аб бесперашкодным і бязмытным гандлі нямецкім купцам у рускіх гарадах, а рускім – у гарадах Балтыйскага ўзбярэжжа, на Готландзе, прычым любымі таварамі і ў любой колькасці. Мясцовыя смаленскія ўлады павінны былі садзейнічаць урэгуляванню адносін нямецкіх гандляроў з валоцкімі цівунамі, якія былі надзелены фіскальнымі функцыямі і імкнуліся спаганяць мытныя падаткі на зручных гандлёвых адрэзках – валоках. Валоцкія цівуны абавязаны былі неадкладна дапамагаць пры пераправе праз валокі замежным гандлярам, каб пазбегнуць іх сутыкнення з мясцовым насельніцтвам. Перавозчыкі-валачане павінны былі несці калектыўную адказнасць за страту тавара.

Таксама нямецкія і рускія купцы атрымлівалі прывілеі, якія значна спрашчалі магчымасці іх узаемнага тавараабмена. Рускія купцы-крэдытары мелі права на першачарговую кампенсацыю за прадастаўленыя імі тавары нямецкім купцам, і наадварот.

Важна, што дагавор 1229 г. утрымліваў не толькі нормы гандлёвага права, але і крымінальнага, грамадзянскага, абавязковага і нават берагавога. Напрыклад, дагаворам гарантавалася дапамога пацярпелым ад караблекрушэння гандлярам – прадстаўнікам кожнага з бакоў. Нават пры паступленні тавара да пакупніка дагавор куплі-продажу лічыўся непарыўным, і ўсе спрэчныя моманты неабходна было вырашаць праз суд смаленскага князя. У дагаворы былі прапісаны памеры пошлінаў за ўзважванне тавару пры заключэнні гандлёвых аперацый.

У адпаведнасці з дагаворам 1229 г. за забойства свабоднага чалавека з вінаватага спаганялася 10 грывен серабра, духоўнай асобы або пасла – 20, халопа – 1 грыўна серабра. За пашкоджанне вока, рукі або нагі прадугледжвалася выплата ў 5 грывен серабра. Цікава, што у дакуменце такая амаль бяспраўная катэгорыя насельніцтва як халопы лічылася суб’ектам міжнароднага права. Так, калі нямецкі гандляр даваў у пазыку тавар княжацкаму халопу, а той паміраў так і не заплаціўшы, то адказнасць за гэта павінен быў несці той, хто лічыўся спадкаемцам дадзенага халопа [2, с. 12].

Відавочна, што дагавор 1229 г. забяспечваў устойлівыя міжнародныя адносіны паміж купцамі Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай і Гоцкім берагам на падставе ўзаемнасці і раўнапраўя. Ён сведчыць аб адносна аднолькавым узроўні развіцця эканомікі ва ўсходняй і заходняў Еўропе і імкненні знайсці аптымальныя рычагі кіравання гандлёвымі патокамі на шляхах, якія выкарыстоўваліся купцамі.

*Крыніцы і літаратура:*


1. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля / Л.В. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 294 с.
2. Дагаворы і граматы як крыніцы беларускага феадальнага права : дапам. для студ. юрыдычнага фак-та / Я.А. Юхо [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2000. – 127 с.
3. Дук, Д.У. Полацк і палачане (IX–XVIII стст.) / Д.У. Дук. – Наваполацк : ПДУ, 2010. – 179 с.
4. Зарождение и эволюция торгово-пошлинных отношений (V – середина XIV века) / сост. Ю.Г. Кисловский. – М. : Изд-во Российской таможенной акад., 2010. – 336 с.
5. Смоленские грамоты XIII–XIV вв. / под ред. Р.И. Аванесова. – М. : Академия наук СССР, 1963. – 141 с.
6. Штыхов, Г.В. Города Полоцкой земли (IX–XIII вв.) / Г.В. Штыхов. – Минск : Наука и техника, 1978. – 160 с.


## НЕАПОЛИТАНСКОЕ КОРОЛЕВСТВО В МЕЖДУНАРОДНОЙ ПОЛИТИКЕ АНЖУЙСКОЙ ДИНАСТИИ (1266–1343 гг.)

В.П. Олейникова (Неаполь)

В начале XIII в. французский король *Людовик VIII, прозванный Лев* (*Louis le Lion*, *1187–1226*) оставил Францию старшему сыну *Людовику IX Святому (1214–1270)*, а младшему отпрыску – *Карлу (1227–1285)* – завещал *апанаж* [7, p. 6] в графстве Анжу.